*ПАКАЛЕННЕ-XXI*

# Вясна ў прыродзе і ў душы



Сцэнічны вопыт у Таццяны Бязлюдавай яшчэ невялікі. Пасля заканчэння музычнага аддзялення Салігорскага педагагічнага каледжа дзяўчына стала працаваць у калектыве гарадскога Дома культуры. Як цудоўнай вакалістцы, ёй даручылі ўзначаліць харавы народны калектыў “Родны напеў”.

— Таццяна цікавы і добры малады спецыяліст, які падае спадзяванні на творчы рост, актыўна ўдзельнічае ў шматлікіх мерапрыемствах, адразу ж паступіла на завочны факультэт Беларускага універсітэта культуры, — заўважае начальнік аддзела культуры Салігорскага райвыканкама Наталля Гапановіч. — Шчыра скажу, пабольш бы такіх дзяўчат ішло да нас. Ды і хлопцаў таксама.

**Мікалай АБОДЗІН, фота аўтара**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ